View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Канфлікт экзістэнцыяльнага і сацыяльнага ў прозе А. Мрыя і А. Платонава

Пачатак XX стагоддзя фарміраваў трагічнае адчуванне глыбокіх перамен не толькі ў сацыяльна-палітычным жыцці, але і ў светапоглядным, перамен, вялікіх па маштабах і па сутнасці. Самым карэнным чынам мяняўся погляд на чалавека: што ёсць чалавек, асяроддзе, у якім ён жыве, і як ён павінен жыць. Пераасэнсоўваліся і задачы мастацтва. "Сацыяльны заказ" рэвалюцыі 1917 года давялося выконваць кожнаму пісьменніку: і таму, хто прыйшоў у літаратуру пасля рэвалюцыі, і мастакам дарэвалюцыйнай загартоўкі, чый жыццёвы і прафесійны вопыт быў ужо агульназначным і для каго параацэнка каштоўнасцей была балючым працэсам.

У канцы 20-х — пач.30-х гадоў набіраў сілу так званы працэс "макеціравання літаратуры" (М.Чудакова), калі пісьменнікі павінны былі падпарадкоўвацца адпаведным ідэалагічным штампам, не выходзіць за межы дазволенага, што істотна дэфармавала экзістэнцыяльныя параметры асобы, быційны пачатак у жыцці чалавека. Новаму пакаленню пісьменнікаў, якое прыйшло ў літаратуру ад плуга і станка, трэба было вучыцца майстэрству ўздзеяння словам на чытача. Ідэю "літаратурнай вучобы" ў свой час падтрымаў М.Горкі. Пралетарскі пісьменнік пісаў: "Прежде всего нужно использовать технику классиков. Что вы получите у Достоевского, кроме техники? (...) большинство его философских идей тоже вам чуждо, потому что с господом богом мы как будто уже рассчитались, я думаю, всерьез и навсегда, мы стали гораздо умнее богов, гораздо больше знаем. Так что в этом отношении Достоевский нам не интересен (...). У Толстого можно научиться тому, что я считаю одним из крупнейших достоинств художественного творчества, — это пластике, изумительной рельефности изображения" [1, с.67-68]. За ўвагай да слова, як вынікае са слоў М.Горкага, хавалася ігнараванне філасофскіх праблем, пытанняў быцця — такіх неабходных складнікаў паўнавартаснай літаратуры. Рэпрэсіі сталінскага часу гвалтоўна звузілі спектр магчымасцей прыгожага пісьменства і істотна запаволілі літаратурную дынаміку. Толькі

ўспрыняцце жыцця можа быць увасоблена ў шматлікіх формах, одной з такіх форм стаў антыутапічны накірунак.

Уласцівыя чалавеку мары аб ідэальным грамадстве канчаткова разбураны сітуацыяй цяперашняга свету, і сёння ўжо з поўнай перакананасцю можна гаварыць аб антыутапічнай тэндэнцыі літаратуры XX стагоддзя ("Мы" Я.Замяціна, "Замак" Ф.Кафкі, "О дзіўны новы свет" О.Хакслі, "Запіскі Самсона Самасуя" А.Мрыя, "Гульні сучаснікаў" Кэндзабура Оэ, "Вайна канца свету" Марыё Варгас Льоса, "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В.Казько, "Ферма", "1984" Дж.Оруэла, "451° па Фарынгейту" Р.Брэдберы, "Элементарныя часціцы" М.Уэльбэка). Разбурэнне сацыяльных, саслоўных перашкод пасля Кастрычніка 1917 года сведчыла аб пэўнай дэмакратызацыі грамадства, але працэс гэты, на жаль, не быў паступовым. Рэвалюцыя стала тым выбухам, які ўзарваў стары лад, пазбавіўшы яго магчымасцяў паступовай трансфармацыі ў новую якасць.

Паслярэвалюцыйны час засведчыў, што папярэдні спосаб зносін паміж людзьмі закончыўся і настаў іншы. Гістарычны злом пачаў фарміраваць чалавека, пазбаўленага зваротнай сувязі з мінулым. Вось як пра гэта піша расійскі даследчык А.Шындзель: "Прошлого <…> для него [паслярэвалюцыйнага чалавека — Т.Т.] не существовало. Поэтому ему не о чем было сожалеть. Будущего этот человек тоже не знал, потому что будущее прозревается из знаний и прошлого опыта, а у него не было ни того, ни другого. Будущее он создавал чистым воображением, а это безошибочный признак детства. Как каждый народившийся на свет, он обладал только настоящим. Все, что видел, все, что понимал, все, о чем думал, — все было его настоящим" [2, с.208-209]. Чалавечы розум, згубіўшы, такім чынам, апору ў культурных каштоўнасцях папярэдніх цывілізацый, становіцца вельмі небяспечным для перспектыў развіцця цывілізаванага чалавецтва. Парушаная пераемнасць культуры аказваецца здольна выклікаць маштабную катастрофу ў межах не толькі адной краіны, аб небяспечнасці такога эксперыменту для грамадства папярэджвалі многія вядомыя пісьменнікі і філосафы. Так, М.Лоскі пісаў: "Узость сознания ценностей при условиях, настоятельно сосредоточивающих

внимание на какой-либо ценности, приводит к преувеличению ее значения и, таким образом, к искажению идеала поведения" [3, с. 90].

Носьбітам не толькі культурных традыцый, але і этычнага мыслення да Кастрычніка з'яўлялася старая інтэлігенцыя, функцыя якой была ў асэнсаванні накопленай інфармацыі. Яна перашкаджала пранікненню ў вышэйшую ўладу крымінальнага мыслення, у якім пераважалі інстынкт, адсутнасць духоўнай сферы і дзе "галоўнай каштоўнасцю для індывіда было фізічнае адчуванне жыцця" [2, с. 216]. Паказальны ў гэтым плане пералік абавязкаў галоўнага героя рамана А.Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя", якому згодна з распрацаванай райкомам "інструкцыяй аб карыстанні жыццём" на інтэлектуальныя разважанні час не адводзіўся, бо, будучы "сябрам РВК, старшынёй дзіцячай камісіі, старшынёй т-ва "Прэч несвядомасць", т-ва "Няхай гадуюцца дзеткі", сябрам праўлення т-ва прыхільнікаў "здахаты на буржуазею", раённым інспектарам працы, сябрам жаночай камісіі РВК, райлітам і аховай здароўя, райМОПРам, райхімам, сябрам раённай абортнай камісіі і саюза паляўнічых" [4, с. 59], чалавек перастае належыць самому сабе. Такая колькасць абавязкаў героя выключае магчымасць напружанага інтэлектуальнага роздуму, які ў новым грамадстве — рэч непатрэбная, нават шкодная. Прыгадаем дыялог з аповесці "Катлаван" А.Платонава: "Администрация говорит, что ты стоял и думал среди производства, — сказали в завкоме. — О чем ты думал, товарищ Вощев?

— О плане жизни.

— Завод работает по готовому плану треста. А план личной жизни ты мог бы прорабатывать в клубе или в красном уголке.

— Я думал о плане общей жизни. Своей жизни я не боюсь, она мне не загадка.

— Ну и что ж ты бы мог сделать?

— Я мог выдумать что-нибудь вроде счастья, а от душевного смысла улучшилась бы производительность.

— Счастье произойдет от материализма, товарищ Вощев, а не от смысла. Мы тебя отстоять не сможем, ты человек не сознательный, а мы не желаем очутиться в хвосте масс" [5, с. 369].

Мысленне Вошчава дыялектычна па сваёй сутнасці: працэсы маральнага развіцця чалавека, эканамічнага росквіту краіны і жыцця грамадства ўзаемазвязаны, бо ўсё ідзе ад чалавека, праз прызму яго свядомасці. Сутыкненне дагматычнага мыслення прадстаўніка ўлады з гуманістычным поглядам Вошчава сведчыць аб няздольнасці гэтай улады мысліць хоць крыху інтэлектуальна. Жыццё асобы абумоўлена не толькі сацыяльным асяроддзем і біялагічнымі працэсамі, але і "индивидуальным "я", как онтологическим ядром, которому в жизни личности принадлежит главенствующая роль" [3, с. 207]. Поўнае ігнараванне інтарэсаў асобы, празмерная яе сацыялагізацыя небяспечна для развіцця грамадства.

Паслярэвалюцыйная светабудова "нараджалася з вайны" горада з вёскай і прыродай. Самсон Самасуй пагарджае бацькоўскай сялянскай працай, руйнуе пасевы жыта і грэчкі, арганізаваўшы салярый каля Сіняй рэчкі, нішчыць сенажаць. ("Уся сялянская праца не мае сэнсу" [4, с. 90]. "Як жа? Буду калупацца ў пясочку вашым? <...> Якое тут жыццё? Бачыўшы цывілізацыю, які разумны чалавек пачне рабіць гэта калупайства ваша? Краты вы, а не людзі! Які сэнс у вашай крацінай працы?" [4, с. 31]. Спадчына прадзедаў: песні, прыказкі, забабоны — у Самасуя трапляе ў разрад "усякага непатрэбнага глупства".

Герой рамана Платонава "Чэвенгур" Чапурны таксама непрыязна ставіцца да сялянскага побыту: не падабаецца яму пах цёплага малака і аўчыны, на прыроду глядзіць як на "неарганізаваную" рэч ("пролетариат не любуется видом природы, а уничтожает ее посредством труда" [5, с. 252]. Прычыны адрыву ад бацькоўскіх каранёў варта шукаць у ідэалагічнай канцэпцыі новай улады: бацькі — гэта мінулае, з якім пажадана парваць, спадчыннасць непатрэбна прывязвае героя да ўчарашняга, будаўніцтва трэба пачынаць з нуля, не павінна быць ніякай пераемнасці. ("Взрослые люди — сироты" [5, с. 142]. "Что нам делать в будущем коммунизме с отцами и матерями? — думает

Дванов" [5, с. 152]). Безбацькаўшчына становіцца гонарам героя, а не спачуваннем яму. Нават павага да зямлі як прамаці ўсяго жывога знікае з свядомасці "новых" людзей.

Праца трапіла ў катэгорыю перажыткаў мінулага, таму вітаецца ўсё дармавое ці хутчэй нават трафейнае, тое, што засталося ад былога класа эксплуататараў. У выніку — незасеянае поле само родзіць пад промнямі "сусветнага пралетарыя" — сонца; лебяда, крапіва і пшаніца — "інтэрнацыянал злакаў і кветак" [5, с. 247] — "па-братэрску растуць" на полі і кормяць чэвенгурскіх перасяленцаў. "Занятия же людей были не обязательными, <…> труд раз навсегда объявлялся пережитком жадности и эксплуатационно-животным сладострастием, потому что труд способствует происхождению имущества, а имущество — угнетению" [5, с. 190].

Шапялёўская арганізацыя чырвонаскурых (ШАЧ), арганізаваўшы сонечную кампанію, мае на мэце "адарваць дзяцей ад бацькоў, ад хаты, ад гаспадаркі" [4, с. 89]. Інтэлектуальная праца набывае ў А.Мрыя таксама пачварныя формы: паэмы Пушкінзона "За тваім гарбатым носам нічога не бачу", "Кроў і зялеза"; лозунгі "Далоў усмішку міжнароднага капіталу!", "Разгонім змрок і зёл, які напусцілі на нас цар і буржуазея спераду і ззаду!", "Пі ваду свежую, чыстую, вараную!"; лекцыі "Аб стварэнні свету", "Аб гангрэнах нашага часу", "Аб ролі жанчыны наогул і ў прыватнасці", "Аб рэлігіі, як стадыі масавага шаленства".

Жывыя людзі для Самасуя — "несвядомая маса", у якую, па яго словах, трэба "прасунуць" навуку, мастацтва і хараство, у А.Платонава людзі аб’яднаны паняццем "пралетарскае рэчыва", "сацыялістычнае рэчыва", і чытач пазбаўлены магчымасці спасцігнуць яго сутнасць, вылучыць індывідуальныя прыкметы, бо на першым плане альбо дынаміка класавай барацьбы, альбо ідэі сацыялістычнага будаўніцтва. "Пралетарскае рэчыва" Платонава жадае ператварыць сябе ў абсалютны ідэал, варты захаплення і пакланення.

Самаацэнка галоўнага героя Мрыя таксама далёкая ад сціпласці, ён у захапленні ад сваёй дзейнасці і чыннасці. Відавочна, што розум "новых"

інтэлігентаў не мае ніякіх маральна-этычных абмежаванняў, гэта людзі без мінулага і без абавязкаў. Самсон Самасуй, Пашынцаў, Чапурны — пераўтваральнікі свету, апантаныя ідэяй падпарадкаваць чалавеку сілы прыроды, але самая галоўная іх мэта — перарабіць самога чалавека.

Неўтаймаваная энергія герояў-пераробшчыкаў здольна, здаецца, іх фантазію зрабіць рэчаіснасцю. Перашкод на сваім шляху яны не бачаць, бо іх светапоглядныя пазіцыі супадаюць з генеральнай лініяй новай улады. Старшыня РВК т. Сом пра Самасуя кажа: "Такія людзі нам патрэбны. Часам дзірку якую заткнуць" [4, с. 111]. Сэнс новага светаўладкавання выдатна сфармуляваны машыністам-настаўнікам з рамана "Чэвенгур": "Людей много, машин мало" [5, с. 15]. "Человек — чушь!.. Он дома валяется и ничего не стоит..." [5, с. 33]. Героі-"інтэлігенты" хутка самі становяцца апаратам улады і носьбітамі ідэалогіі той дзяржаўнай машыны, якая пазней будзе асацыіравана са сталінскай. Запатрабаванасць кіраўніцтвам нараджала неабмежаваную свабоду духа неабцяжараных мараллю людзей. Тэндэнцыя набывала агульнадзяржаўны маштаб і становілася з’явай небяспечнай. І Платонаў, і Мрый добра ўсведамлялі яе філасофскі абсурд.

Маральны выбар чалавека па прыродзе сваёй заўсёды трагічны, трагічны ён і для асобы Самсона Самасуя. Сам ён гэтага не заўважае, але ўся яго істота прасякнута фальшывасцю: гэта і несапраўднасць чалавечых зносін, і абсурднасць дзеяння, і хлусня самому сабе. Смага эгаістычнага самасцвярджэння заставіла Самасуя адкінуць нормы прыстойнасці, маралі, законы логікі і стаць на пазіцыю: "Пройдзе ўсё, а я застануся" [4, с. 77]. Да спадобы Самасую прыйшлася філасофія суддзі Торбы: "Трэба ўсюды торкацца, як Піліп з канапель! У гэтым сакрэт перамогі ў жыцці!" [4, с. 81]. Нізкі маральны ўзровень асобы пры ўладзе, як вынікае з рамана А.Мрыя, стрымлівае прагрэсіўнае развіццё грамадства, перашкаджае яго членам быць маральна адказнымі асобамі.

Беларускі пісьменнік у фарсавай манеры праілюстраваў прапанаваную Самсонам Самасуем мадэль "зямнога раю" ў асобным мястэчку Шапялёўка.

Ідэя сусветнага працвітання на зямлі заўсёды моцна сядзела ў народнай свядомасці, а рэвалюцыі толькі падагравалі яе і пераводзілі з разраду абстрактных мар у дасягальную рэчаіснасць. У горадзе Чэвенгур працавала адно толькі сонца, аб’яўленае "сусветным пралетарыем", а двары, ябланевыя сады параслі пустазеллем. Камсамолец Дусік з рамана А.Мрыя заяўляе: "Перад намі сонца, паветра, вада, а мы не ўзялі іх на рэмус, не прыцягнулі да адказнасці. Няхай яны працуюць нам, як мы працавалі панам!" [4, с. 88]. Чэвенгур, Шапялёўка — будаўнічыя пляцоўкі новай рэальнасці, дзеля ажыццяўлення якой трэба толькі, па словах Чапурнага, "класс остаточной сволочи" ліквідаваць. Чэвенгур і Шапялёўка — гэта яшчэ і новы спосаб зносін паміж людзьмі. У Чэвенгуры цалкам ігнаруюць губернскія загады, каб будаваць новае на абсалютна пустым месцы, і шчасце выдаюць "по мере классовой надобности", а "люди друг для друга как идеи" [5, с.353]. У адпаведнасці з логікай новых будаўнікоў для чалавека самым надзённым з’яўляецца ідэя, а калі яна не ўспрымаецца, дапускаецца насілле, гвалт. І Шапялёўка, і Чэвенгур —"гэта адлюстраванне ідэі, скажонай неразвітай самасвядомасцю толькі што народжанага грамадства" [2, с. 214], пазбаўленага пакутлівай духоўнай працы. З Чэвенгура выдалена сама здольнасць чалавека мысліць, жыхары толькі праз эмоцыі здольны спасцігаць свет. Горад як прыклад "зямнога раю" гіне, і не з-за нейкіх варожых сіл, прычыны трэба шукаць у самім грамадстве, бо дзеля будучыні аказваецца патрэбна жыццё "ўсіх жыхароў, каб не давялося паміраць ім потым на пераходных ступенях". У выніку ўсе расстраляны, засталося толькі адзінаццаць чалавек, святло ў будынках пагасла, бо "жизнь отрешилась от этого места и ушла умирать в степной бурьян" [5, с. 227], — канстатуе А.Платонаў.

Загадчык аддзела культуры Самсон Самасуй, мясцовыя настаўнікі, паэт Гарачы (Пушкінзон) — асобы, якія па сутнасці сваёй павінны быць ахоўнікамі асноў цывілізацыі, на самай справе аказваюцца нікчэмнымі, духоўна беднымі людзьмі. Мастацтва ў "Запісках..." перастае быць спосабам выяўлення духоўнай культуры асобы, яно, набыўшы пачвырныя формы, заглушае голас унікальнай чалавечай душы. Трыумф бязглуздных ідэй галоўнага героя Мрыя

ставіць крыж на маральных каштоўнасцях, што з цягам часу будзе вельмі небяспечным для чалавека. Нованароджаныя формы быцця, вынаходніцкія мадэлі светабудовы, на думку А.Мрыя і А.Платонава, аказваюцца нікчэмнымі, калі яны пазбаўлены маральна-этычных нормаў. Расплата за утопію, за ілюзіі, як паказала гісторыя XX ст., фантастычна высокая і не можа быць апраўдана ніякімі сродкамі.

Пры ўсім трагізме гістарычных зломаў яны, як гэта не парадаксальна, нясуць у сабе і пазітыўны момант, бо выяўляюць сапраўдную сутнасць чалавека як істоты адказнай перад гісторыяй. Адказнасць перад самім сабой і грамадствам, перад каштоўнасцямі культуры і цывілізацыі можа несці толькі чалавек свабодны. У гады сацыяльных катастроф праблема свободы чалавека паўстае надзвычай востра. Неспрыяльныя знешнія абставіны абвастраюць інстынкт уласнага самазахавання і могуць істотна звузіць усведамленне агульначалавечых каштоўнасцей, аб гэтым нагадваюць беларускі і рускі пісьменнікі. Песімістычны настрой твораў Платонава і Мрыя трэба ўспрымаць як сур’ёзнае папярэджанне тым, хто прагне скажаць чалавечы дух дзеля новых сацыяльных эксперыментаў. Аляксандр Дванаў, самы блізкі Платонаву герой, сведчыць: "Здесь <…> не механизм лежит, здесь люди живут, их не наладишь, пока они сами не устроятся. Я раньше думал, что революция — паровоз, а теперь вижу, нет" [5, с. 300].

Для ажыццяўлення сацыяльных мэт кожны чалавек выбірае свой шлях у адпаведнасці з уласным экзістэнцыяльным светаадчуваннем. Утапічная ідэя агульнай роўнасці, дабрабыту патрабавала перш за ўсё перабудовы чалавека. Да такіх пераўтварэнняў прычыніліся ідэолагі ад улады, якія выпрацавалі цэлы механізм формазагатоўкі чалавека грамадства суцэльнага калектывізму — праз страх, тэрор, пагрозы, праз масавае, калектыўнае радзенне (суботнікі, сонечныя кампаніі, сялянскія сходы, калектыўныя нарады) завалодаць унутраным светам чалавека, падпарадкаваць яго свядомасць. Герой Мрыя прагне ахапіць сваёй дзейнасцю як мага больш людзей, людзі Чэвенгура выступаюць як адна рэч для другой. Герой Капенкін ("Чэвенгур") канстатуе: "У нас же все решается по

большенству, а почти все неграмотные, и выйдет когда-нибудь, что неграмотные постановят отучить грамотных от букв — для всеобщего равенства..." [5, с. 124]. Чалавек з новай "калектыўнай ідыліі" пазбаўлены не толькі права на ўласнае жыццё, але і на сваю самасць, індывідуальнасць.

Класічная філасофская думка (М.Бердзяеў, Л.Шастоў, М.Лоскі, Э.Фром, Ж.-П.Сартр, А.Камю, Г.Фядотаў) ў поглядах на праблему ўзаемастасункаў экзістэнцыяльнага і сацыяльнага перавагу аддае гарманічнаму іх спалучэнню. М.Лоскі, напрыклад, пісаў: "Ценность личности выше ценности неличных аспектов бытия…" [3, с.197], але яны "могут войти в состав жизни личности и придавать ей полноту и содержательность. <…> Столкновение возникает тогда, когда общество требует от индивидуума борьбы за ценности, стоящие вне его понимания и кругозора. Предотвратить это нарушение гармонии душевной жизни можно путем воспитания любви к таким высоким ценностям, которые необходимо связаны с бесчисленным множеством содержаний жизни" [3, с. 199—200]. А працэс выхавання доўгі і крапатлівы, патрабуе часу і вялікіх намаганняў, што не адпавядала планам новай улады на хуткую перабудову грамадства. Пісьменнік-філосаф канца XX ст. М.Кундэра зазначае: "... личное и общественное — два мира, разные по своей сути, и <…> уважение к этому различию является условием sine qua non, для того, чтобы человек мог жить как человек свободный <…>. <…> обнародование личной жизни другого, как только это возводится в привычку и в правило, вводит нас в эпоху, когда самой большой ставкой является выживание или исчезновение личности" [6, с.266].

Безумоўна, аднолькава небяспечна гіпертрафіраваць як вагу асобы ў грамадстве, так і ўплыў грамадскай думкі на асобу. Мастацкая літаратура XX ст. прыводзіць шматлікія прыклады такіх памылак. Асоба чалавека не вычэрпваецца толькі біялагічным і сацыяльным зместам, варта ўлічваць яшчэ і "индивидуальное "я", как онтологическое ядро, которому в жизни личности принадлежит главенствующая роль" [3, с. 207]. Высокамастацкія вобразы прыгожага пісьменства актуалізуюць індывідуальнае "я" як важкі анталагічны пачатак — носьбіт жыццёвых сэнсаў сусветнага маштабу: чалавек і Бог,

абсалютная ісціна і абсалютнае дабро, вышэйшая праўда і законы маралі. Для А.Мрыя і А.Платонава ігнараванне экзістэнцыяльнага патэнцыялу чалавека бачыцца шкодным і небяспечным, бо патрабуе поўнага падпарадкавання асобы грамадству, пазбаўляе яе асобасных свабод і права на самарэалізацыю.

Відавочна, што тоеснасці паміж экзістэнцыяльным і сацыяльным быць не можа, важна, каб супярэчнасці паміж імі былі найменш канфліктнымі, каб сацыяльнае не перашкаджала рэалізацыі пазітыўна экзістэнцыяльнага, спрыяла яго раскрыццю і, наадварот, стрымлівала негатыўныя яго праявы.

ЛІТАРАТУРА

1. Горький М. Собр. соч. в 30 т. Т.26. / М.Горький. — М.: Гослитиздат, 1953. — 463 с.
2. Шиндель А. Свидетель (заметки об особенностях прозы Андрея Платонова) / А.Шиндель. — Знамя. — 1989. — № 9. — С. 207—217.
3. Лосский Н.О. Условия абсолютного добра: Основы этики; Характер русского народа / Н.О.Лосский. — М.: Политиздат, 1991. — 368 с.
4. Мрый А. Творы: Раман, апавяданні, нататкі / Уклад. і прадм. Я.Лецкі. — Мінск.: Маст. літ., 1993. — 317 с.
5. Платонов А. Избранное / А.Платонов. — Минск, "Университетское", 1989. — 574 с.
6. Кундера М. Нарушенные завещания: Эссе / Пер. с фр. М.Таймановой/ М.Кундера. — СПб.: Азбука-классика, 2004. — 288с.

РЭЗЮМЕ

У артыкуле "Канфлікт экзістэнцыяльнага і сацыяльнага ў прозе А.Мрыя і А.Платонава" разглядаецца праблема ўзаемастасункаў экзістэнцыяльнага і сацыяльнага ў антыутапічных творах пісьменнікаў. Мастацкі вопыт А.Мрыя і А.Платонава засведчыў, што жыццё асобы абумоўлена не толькі сацыяльным асяроддзем і біялагічнымі працэсамі, але і індывідуальным "я" як анталагічным цэнтрам асобы. У гады сацыяльных катастроф праблема свободы чалавека стаяла надзвычай востра. Неспрыяльныя знешнія абставіны абвастралі інстынкт уласнага самазахавання герояў і істотна звужалі ўсведамленне імі

агульначалавечых каштоўнасцей. Высокамастацкія вобразы А.Мрыя, А.Платонава раскрывалі індывідуальнае "я" як носьбіта жыццёвых сэнсаў сусветнага маштабу: чалавек і Бог, абсалютная ісціна і абсалютнае дабро, вышэйшая праўда і законы маралі. Ігнараванне экзістэнцыяльнага патэнцыялу чалавека бачыцца пісьменнікам шкодным і небяспечным, бо патрабуе поўнага падпарадкавання асобы грамадству, пазбаўляе яе асобасных свабод і правоў на самарэалізацыю.

SAMMARY

The article “Conflict between Existential and Social in the Prose by A. Mria and A. Platonov” deals with the problem of existential and social in the anti-utopias works of the authors. A. Mria and A. Platonov’s fictional experience showed that the life of the personality depends not only on the social milieu and biological processes, but also on individual “Self” as the ontological center of the personality. The freedom of the personality during social cataclysms is the keenest problem. Hostile external world aggravated the heroes’ instincts of self-protection and narrowed considerably their comprehension of human values. Highly fictional images portrayed by A. Mria and A. Platonov displayed the individual “Self” as a bearer of life senses worldwide: a human and God, absolute goodness, highest truth and moral laws. According to the authors ignoring the existential potential of a human is harmful and dangerous as it equires total submission of the personality to a society, deprives him of the freedom and the right to self-realization.